перакладчыка. Былі дакладна вызначаны падставы, па якіх дапускалася адступленне ад прынцыпу галоснасці. Закрытыя судовыя пасяджэнні дапускалюя толькі ў выпадках, калі публічнае слуханне справы з'яўлялася непажаданым для абароны інтарэсаў дзяржавы або абставіны яго тычыліся інтымнага жыцця бакоў, аднак рашэнні суда ва ўсіх выпадках аб'яўляліся публічна (арт. 96). Удакладняўся парадак разгляду спраў у судзе. Слуханне пачыналася з даклада старшынствуючага, пасля чаго бакам прапаноўвалася даць тлумачэнні. Адказчыку забяспечвалася магчымасць адказаць на кожнае тлумачэнне істца (арт. 106).

Важную ролю ў забеспячэнні правільнага і аднастайнага прымянення грамадзянска-працэсуальных норм, умацаванні законнасці ў галіне грамадзянскага судаводства ігралі пастановы, цыркуляры, інструктыўныя пісьмы і наказы пленума Вярхоўнага Суда БССР і яго грамадзянскай касацыйнай калегіі. Вышэйшым судовым органам рэспублікі давалюя кіруючыя растлумачэнні па важнейшых прынцыповых пытаннях прымянення грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства.

## РАЗВІЦЦЁ АДВАКАТУРЫ Ў ПЕРЫЯД ЗНАХОДЖАННЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

***А. А. Гур'ева**, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

У выніку заключэння Люблінскай уніі 1569 г. на карце Еўропы з'явілася новая дзяржава – Рэч Паспалітая, якая ўяўляла сабой саюз дзвюх дзяржаў: Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Унія Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай 1569 г. прывяла да шматлікіх змен ў заканадаўстве і запатрабавала перагляду і дапаўнення Статута 1566 г. З гэтага часу на тэрыторыі ВКЛ узнікаюць новыя суды па польскаму прыкладу, у выніку чаго павінен быў змяніцца і інстытут адвакатуры.

У 1581 г. быў створаны Галоўны трыбунал ВКЛ. Законам аб яго стварэнні рэгламентавалюя палажэнні, якія вызначалі пэўныя правілы працы суда, яго склад, паўнамоцтвы і інш. Аб дзейнасці прадстаўнікоў і адвакатаў узгадваецца толькі ў двух раздзелах закона. У прыватнасці, у дзявятым раздзеле «Бяспека суддзяў і парадак выступу перад Высокім судом» вызначаны асобы, уключаныя ў склад суда, самі бакі і максімальная колькасць людзей, якія маюць права ўдзельнічаць у пасяджэнні суда ў якасці сяброў, якія дзейнічаюць па даверанасці, і прадстаўнікоў. Чатырнаццаты раздзел «Вышэйшая сіла судовых рашэнняў» прадугледжваў, што суд быў створаны ў якасці вышэйшай і апошняй інстанцыі Княства. Артыкулы гэтага раздзела па сутнасці абмяжоўвалі ўладу вялікага князя, бо пасля вынясення Трыбуналам рашэння ўдзельнікі працэсу ўжо не маглі апеляваць да князя ці Сойму. Тым не меньш, асабліва настойлівыя ў пошуках праўды, якія спрабавалі звярнуцца да князя, караліся

штрафам у сто коп грошай. Тыя ж з прадстаўнікоў (адвакатаў), хто браў на сябе абавязак дапамагчы ў аспрэчванні, караліся тыднем зняволення ў турэмнай вежы суда. Соймавай канстытуцыяй 1726 г. унесены папраўкі ў палажэнне аб Галоўным судзе, згодна з якімі прадугледжвалася працэдура выкліку адваката ў суд, а з мэтай недапушчэння зацягвання судовага працэсу адвакатам, узяўшым на сябе абавязак па абароне аднаго з бакоў, забаранялася ўдзельнічаць у іншым працэсе або перайсці на адваротны бок. У гэтым дакуменце адвакатура ўзгадвалася як прафесійны інстытут пад назвай Палестра – тэрмін, які быў пазычаны з польскай этымалогіі.

У 1781 г. маршалкам Трыбунала Адамам Чартарыйскім былі прапанаваны новыя правілы вядзення спраў у судзе, якія называліся «Папярэджанні». Імі прадугледжваўся абавязак своечасовай падрыхтоўкі бакоў і іх адвакатаў да судовага пасяджэння, а таксама яго рэгламент і адказнасць за парушэнне ўсталяванага тэрміну разгляду спраў.

У 1793 г. гарадзенскі сойм прымае Палажэнне пра адвакатуру, усталёўваючы адзіныя прававыя нормы адносна гэтага інстытута для Кароны і ВКЛ. Палажэннямі былі замацаваны правілы дакументазвароту, а таксама рэгламентавалася неабходнасць весці спіс адвакатаў і адзначалася, што толькі асобы, якія ўнесены ў яго, мелі права займацца юрыдычнай практыкай. У спісы ўносіліся імёны адвакатаў па кожным ваяводстве і ім дазвалялі ажыццяўляць дзейнасць толькі на тэрыторыі пэўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. У Палажэннях пра адвакатуру значна пашырана колькасць падстаў, якія цягнулі для адваката страту працы. У прыватнасці, было прадугледжана 12 такіх выпадкаў, пачынаючы яўкай у суд у нецвярозым стане і сканчаючы атрыманнем хабараў.

Такім чынам, асацыяцыі адвакатаў, сфармаваныя і заканадаўча замацаваныя яшчэ ў XVI ст., спачатку не ўяўлялі сабой ўстойлівай прафесійнай групы. Толькі з цягам часу яны сталі прафесійнай супольнасцю, якая і ўтварыла так званую асацыяцыю адвакатуры пад назвай Палестра.

## РАЗВІЦЦЁ САВЕЦКАЙ НАВУКІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

*С. А. Гур'еў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

З абвяшчэннем Беларускай ССР пачалося стварэнне дзяржаўных органаў і арганізацый, якія займаліся навуковымі даследаваннямі ў галіне крымінальнага права найперш у сувязі з неабходнасцю распрацоўкі ўласнабеларускіх крымінальна-прававых актаў. Найбольшую ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі Наркамат юстыцыі БССР (створаны ў 1919 г.) і Белдзяржуніверсітэт (створаны ў 1921 г.). Стварэнне гэтых заканатворчых і навуковых цэнтраў паступова прывяло да станаўлення беларускай савецкай навуковай школы крымінальнага права. У выніку 1920-я гг.